## АДЛІГА

Быў спакойлівы зімовы вечар. Я сядзеў за пісьмовым сталом і ўважна ўчытваўся ў радкі Вангогавых лістоў да брата Тэадора. Раз-пораз я прымушаў сябе на колькі хвілін адрываецца ад кнігі, каб асэнсаваць, больш цэльна ўспрыняць прачытанае і каб адпачылі вочы.

Сьвятло лямпы лілося расплывістым конусам на бель старонак і на віна-залацістую паліроўку стала. Абажур утвараў на цьмяна-бэзавай столі мяккі круг, а дакладней — паўкружжа. Другая частка кругу прыпадала на паверхню, паклееную вохрыстымі, у штрых цісьнёнымі шпалерамі. Шырокае, ледзь не на ўсю сьцяну вакно было зацягнутае бардовымі шторамі з атласнай тканіны. Праз шчыліну між імі было відаць, што на дварэ ідзе сьнег. Да шыбаў ляпіліся крышталікі ў выглядзе зорачак, шасьцігранькікаў і шасьцярэнькаў. Але яны хутка страчвалі сваю канфігурацыю, раставалі, аплывалі сьлязамі.

Званок у дзьверы прагучаў ледзь не апоўначы. Не празьвінеў — бо быў мэлядычны — а толькі ўскалыхнуў сутонлівую вусьцішнасьць кватэры падвоенай хваляю.

"Хто б гэта мог быць?" — мільганула зьдзіўленьне. Са шкадобай я адклаў кнігу і пайшоў адчыняць. Прынік да дзьвярнога вочка. Постаць мужчыны, але пазнаць было нельга: на пляцоўцы ў нас цемнавата.

"Можа, спытаць, хто там?" — падумаў я і амаль адначасова павярнуў ключ.

— Гэта я —Лукаш. Не пазнаеш? — шырока ўсьміхнуўся на маё нямое запытаньне невысокі чалавек. Выглядаў ён стомленым. Ня голенае некалькі

дзён шчаціньне ўзмацняла гэтае ўражаньне. А можа, твар выдаваў абяскроўленым і з-за доўгага знаходжаньня ў холадзе. На вуліцы я сапраўды наўрад ці пазнаў бы яго.

— Заходзь, — адказаў я замест прывітаньня.

— Ага, здароў. А я вось тут... — пальцы яго нэрвова прайшліся па гапліках. — Дык я пераначую у цябе? — спытаў ён з напаўсьцвярджальнай інтанацыяй.

— Чаму ж не. Распранайся ўжо, як прыйшоў. — У голасе маім, мабыць, не было асаблівай радасьці.

Госць пасьпешліва ськінуў боты з невысокімі халявамі. Пасьля вылузнуўся з зашмальцаванага кажушка. Пачапіў яго і ўзгрувасьціў зьверху ультрамарынавы шалік і пярэстую калматую вушанку. Павярнуўся і, падалося мне, нібыта здрабнеў, яшчэ паменьшаў ростам.

"Чалавек заўсёды адчувае сябе няёмка ў чужой вітальні. Мусіць, адна з прычын таго — тутэйшая завядзёнка скідаць абутак. Няўтульна пачуваесься ў шкарпэтках, асабліва, калі яны ня надта чыстыя і папраціраліся на пазногцях, як у Лукаша. Ступаць у чужыя пантофлі таксама не вялікая асалода", — падумаў я, але пасьпяшаўся прапанаваць госьцю свае.

— Праходзь у пакой, — запрасіў я і дадаў: — Ці, можа, лепш на кухню? Павячэраеш?

— Ды не, есьці ня буду. А вось ад кубку гарбаты не адмоўлюся. Зьмерз-такі, — таропка загаварыў ён ды зьнячэўку запытаў. — А ў цябе сёньня, мусібыць, ня ўсе дома начуюць?

— Так, сяджу адзін. А каб і быў хто? Чаго табе турбавацца? — супакоіў я яго.

Ён і папраўдзе паспакайнеў і запытаўся больш даверліва:

— Дык ты не крыўдуеш, што я зайшоў гэтак позна ды без папярэджаньня?

— Ды не, кінь ты, — адказаў я і паставіў імбрык на агонь. — Раскажы лепш, як і дзе ты жывеш цяпер? У Менску ці ў бацькоў?

— Як гэта дзе? Па-ранейшаму, дома жыву, на Ўсходзе.

— А як дачушка твая? Памятаю, як ты прыходзіў зь ёю на працу. Ціхмяная, сур’ёзная такая была ды ўсе малявала "Чырвоную кветку". Вялікая, мабыць, ужо вырасла?

— У другую клясу ходзіць, — неахвотна азваўся ён.

Я наліў заваркі і дадаў кіпеню. Лукаш моўчкі прыняў кубак, які дробна зазьвінеў на сподку. Насыпаў цукру і павольна разьмяшаў. Але выпіў гарбату толькі напалову. Потым устаў і прыпаў да крану. Зрабіў колькі вялікіх глыткоў і прыпаліў сваю заўсёдную пляскатую "Прыму".

"Гэтыя цыгарэты, як найбольш танныя, ён заўседы прасіў набыць, калі я наведваў яго ў псыхлячэбніцы", — мімаволі прыгадалася мне.

Лукаш хадзіў па кухні. Ступаў некалькі крокаў, глыбока зацягваўся і амаль неадрыўна глядзеў на мяне. Куточкі вуснаў у яго былі бязвольна-крыўдліва апушчаныя, але раз-пораз яны падціналіся і па сківіцах ходырам праходзілі жаўлакі. Вочы ж, здавалася, утойвалі запытаньне і смутак.

Даўжэў шэры слупок на цыгарэце. Я не знайшоў нічога лепшага і прапанаваў замест попелкі сподак. Праз колькі хвілін я, каб перапыніць гнятлівую пярэрву, запытаўся:

— А ці даўно ты пайшоў з Палацу? Цябе ж не было на працы, калі я звальняўся.

— Амаль што ўсьлед за табою, — адлучана падказаў ён.

— Слухай, добра, што ўспомніў! Я ж тады мусіў забраць на захаваньне твае кніжкі. Хадзем у пакой — пакажу!

Ён крыху пажвавеў, расьціснуў недапалак і пайшоў усьлед за мною у залю. На кніжнай паліцы хутка адшукаліся патрэбныя манаграфіі.

— Вось тут твой лінарыт, — працягнуў я альбом сучаснай графікі. — Памятаеш?

— Анягож, — амаль адразу ён адгарнуў менавіта тую старонку, уздыхнуў і дадаў: — Гэта ліст з маёй дыплёмнай працы. Астатнія з гэтай сэрыі выразаць не ўдалося — перашкодзіла хвароба. А пасьля, на апошнім праглядзе, зьнікла цэлая папка маіх эскізаў...

— Няўжо так і не знайшліся?! — паспачуваў я.

— У тым і рэч, што не. А былі тыя аркушы цалкам завершаныя — хоць адразу пад разец. Ніяк не магу даўмецца, каму яны маглі спатрэбіцца?... Шкада ўкладзеных сіл і працы, а найбольш — часу. Думаю нават — зламіла мяне тая страта.

— Дарма ты так. Нічога ж не губляецца, не мінае бясьследна.

— А ў цябе калі-небудзь было, каб надта хацелася адкруціць назад некалькі гадоў? — спытаўся ён.

— Думаю, што часам гэтага хочацца кожнаму ці большасьці людзей. Па дзяцінстве ж сумуюць амаль што ўсе.

Лукаш нічога не адказаў, нейкі час задумліва гартаў альбом з рэпрадукцыямі палотнаў Ван Гога, а потым нечакана запытаўся:

— А як па-твойму, ці мог мастак ачуняць, пераадолець сваю душэўную хваробу?

— Давай, можа, заўтра на сьвежую галаву пагаворым пра гэта? А то позна ўжо, — ухіліўся я ад адказу. — Можа, будзем класьціся?

Ён незадаволена цёпнуў плячыма, падняўся і кінуў:

— Ты кладзіся, а я пасяджу яшчэ, папалю на кухні.

Я разабраў канапу і паслаў госьцю сьвежую бялізну, а праз чвэрць гадзіны патушыў сьвятло.

Было чуваць, як тупаўся на кухні Лукаш, як недзе ў трубах цурчэла-перацякала вада, як паўз аранжава-міргатлівыя сьвятлафоры праносіліся апошнія тралейбусы-"двойкі". Я ўгрэўся пад коўдраю, але сон не ішоў. У галаве зноў і зноў пракручвалася гутарка з Лукашом. Згадвалася ягонае запытаньне, на якое я мусіў штосьці адказаць...

У чаканьні, покуль ляжа госьць, я неўпрыкметкі задрамаў, ды прачнуўся ад грукату — Лукаш усё ж зачапіў крэсла каля сваёй канапы. Я не аказаўся і ўдаваў, што сплю. Ён распрануўся і, выстаўляючы рукі перад сабою, наблізіўся да акна. Пастаяў, як самнамбул, у месяцавым сьвятле, разы два ўздыхнуў і, у рэшце зарыпеў спружынамі канапы. Я скарыстаў гэты момант, каб павярнуцца: мулка было ляжаць на адным баку.

Але хутка Лукаш чагось ускочыў і зноў выйшаў. Шлёгнуў выключальнікам у калідоры, потым на кухні. Праз шчыліну ў дзьвярах прабілася лязо лімонна-жоўтага сьвятла. На процілеглай ад мяне сьцяне яно перакрыжавалася са слупом серабрыста-шарага, што сачылася між штораў, адлюстравалася ў шкле кніжнай шафы. Пачуўся лязгат посуду на сушылцы і зьдзеклівае хрыпеньне-вуркатаньне кранаў. Нанач ваду ў нас чамусьці адключалі.

"Відаць, хоча піць, — падумалася мне. — А вада толькі ў імбрыку, дый тая — цёплая". Мусіць, выявіў гэта і ён. Нейкі час было ціха. Пацягнула цыгарэтным дымам.

"Каб хоць ён там здагадаўся адчыніць фортку", — незадаволена варухнуўся загад-пажаданьне. На яго адказалі кухонныя дзьверы і шорганьне пантофляў у калідоры. Стрэліў выключальнік у вітальні. Было чуваць, як круціцца тэлефонны дыск.

"Куды гэта можна званіць сярод ночы бяз дай прычыны? Хіба толькі па тэлефоне даверу?" — са зьдзіўленьнем і абурэньнем падумаў я. Мусіць, на тым канцы не азваліся, і трубка грукнулася на сваё месца. Масьніцы сьведчылі пра нерашучае перамінаньне, але неўзабаве дзьверы ўпусьцілі вінаватага ў маіх пакутах. Ён быў гукнуў мяне, ды і гэтым разам я змаўчаў. Лукаш лёг, але яшчэ доўга варочаўся, кашляў, нешта мармытаў сам сабе. Нарэшце ён заціх.

Я зноўку паспрабаваў лічыць, прамаўляць у галаве формулы спакою, але ніяк ня мог даць рады. Спацеў, і прасьціна зьбілася на мулкія складкі. Здавалася, што калолася пер'е падушкі, а коўдра зрабілася цяжкая і задушлівая...

На дасьвецьці з трывожнага сну-забыцьця мяне абудзіў рэпрадуктар. Гучаў бадзёры марш. Я зь цяжкасьцю расплюшчыў павекі.

На канапе Лукаша не было. Не было і ягонага адзеньня на крэсьле. Гадзіньнік паказваў пачатак сёмай. Я накінуў халат і зазірнуў на кухню.

Сіпеў параю імбрык на пліце. На сподку высіўся курганок недапалкаў. Вільготнае паветра, што ўрывалася праз фортку, усё ж не вынішчыла смуроду ад іх. Я адключыў газ, прыцішыў гучаньне радыё і выйшаў у вітальню.

Лукаш быў ужо апрануты і трымаў шапку ў руках. Разгублена-вінавата ён прамовіў:

— Не хацеў цябе будзіць. Дый наогул ня трэба было мне заходзіць. Толькі дарэмна патурбаваў...

Некуды ўмомант падзеліся мае раздражнёнасьць і крыўда. Я пачаў пераконваць яго ці нават сябе самога:

— Ды якія там турботы! Спаў бы яшчэ — і сямі нават няма. Чаго ты так рана падняўся?

— Трэба ісьці мне. Багата справаў будзе сёньня, — запярэчыў ён.

— Але зараз куды ты пойдзеш? Пачакай крыху. Згатуем сьняданак, вып'ем кавы, а тады і па справах можна было б ісьці.

— Ды не, дзякуй. З раніцы я ня ем. Няма апэтыту, — сказаў ён і папрасіў: — Ты адчыні мне. Даруй, што панепакоіў...

Мне падалося, што нікуды ён не сьпяшаўся, а наадварот, чакаў адказу на сваё пытаньне. І тут ужо мусіў засьпяшацца я, бо цягнуць нельга было.

— Не дароўваць, а дзякаваць вінен я табе. Добра, што ты зайшоў. Якраз і кніжкі свае возьмеш. Чакай! — загадаў я, хуценька прынес іх з пакою і сьпехам пачаў загортваць у газэціну. Бліснула блакітна-смарагдова-кармінавая супэрвокладка з краявідам Овэра. — А што да Ван Гога, — прамовіў я, пазіраючы ў вочы Лукашу, — дык я перакананы, што ён мог бы пераадолець крызыс і пайсьці на папраўку. Шкада, што ня здолеў вытрымаць. Ты, напэўна, згодзісься, часам галоўнае — умець трываць. Трываць, як бы ні даводзілася балюча і цяжка. Бо потым пачынаеш глядзець на мінулае іншымі вачыма, і яно часьцей бачыцца не такім ужо і чорным. Нездарма ж кажуць, што час — найлепшы лекар. І добра яшчэ, калі ў цяжкую хвіліну хтосьці падтрымае хоць словам. А хваробе нельга паддавацца...

— Я і сам усё гэта ведаю, але трэба было і пачуць ад некага, — перапыніў ён мяне. — І ўсё ж я пайду. Хачу пабыць на самоце.

— Што ж... Табе лепш відаць. А ўвогуле ты заходзь. Можа, калі што-небудзь спатрэбіцца, дый заходзь проста, без усялякай надобы. Згода?

— Можа, калі й зазірну, — пацінуў ён плячыма. — Абяцаць ня буду.

— Ну глядзі... Усяго табе найлепшага. Галоўнае — ня падай духам! Калі-небудзь усё ўладзіцца.

Я адчыніў і адступіў убок. Па нагах пацягнула холадам. Лукаш пераступіў невысокі парожак, выклікаў ліфт і зайшоў у кабіну.

— Ты зноў забыўся на кнігі! — усклікнуў я.

— Нічога, хай застануцца табе, — глуха данеслася з кабіны.

Я прычыніў дзьверы. Пачуўся шчаўчок замка, і нейкі час я прыслухоўваўся да гудзеньня ліфту. Зь люстэркаў трыльяжу на мяне зірнулі некалькі блізьнятаў. Яны мелі ўскудлачаныя валасы і рудаватыя бароды. Не ўпрыгожвалі іх мяшкі пад вачыма зь ліхаманкавым сухім бляскам. З-пад барвяна-ліловых пасястых халатаў тырчалі худыя ногі. Блізьняты разам прыкрылі сутаргава разяўленыя раты. Я пазяхнуў ім у адказ, патушыў сьвятло і вярнуўся ў апусьцелы пакой.

Шызаваты сьвітанак струменіў паўз напалову расхінутыя шторы. Плошча, будынкі і дрэвы былі захутаныя шчыльнай заслонай туману і нагадвалі тэатральныя дэкарацыі. Сьнег, што выпаў уначы, адразу ж ушарэў, страціў бялюткасьць і пульхнасьць. Але на ім не было відаць ні сьцяжынкі, ні сьледу аўтамабільных колаў, ні нават росчыркаў птушыных лапак. На душы шчымела.

Я шчыльна зацягнуў шторы, што прасьвечвалі ружаватым срэбрам. Амаль гэткім жа выдаваў і пыл. Роўным слоем лёг ён на паліраваную стальніцу, а таксама на сшыткі, альбомы і кнігі, розныя колерам, памерам і фактураю.

Увушшу трымцела цішыня. Здавалася, што не было нічога больш пэўнага, важкага і бясконцага за яе. Зноў пазяхнулася. Міжвольна перавёў я

позірк на свой ложак. Насьценны каляндар па-над ім нагадваў, што надышла нядзеля.

Можна было паспрабаваць адаспацца.

1984

KAMUNIKAT.org